# *КАРПОВІЧ МАРЫЯ МІХАЙЛАЎНА*

в. Крупава, Шчучынскі раён. Ткацтва.



Марыя Міхайлаўна Карповіч нарадзілася 28 чэрвеня 1944 года ў вёсцы Бабічы Шчучынскага раёна ў сялянскай сям'і. Сёння жыве ў вёсцы Крупава Шчучынскага раёна. Марыя Міхайлаўна Карповіч і цяпер садзіцца за кросны, вышывае гладдзю мясцовыя ўзоры. У калекцыі майстрыхі шмат тканага і вышытага ўбранства для хатняга ўжытку: ручнікі, посцілкі, абрусы, палатняная тканіна. Сваёй дачцэ і сыну выткала вясельныя ручнікі. “Таму і сем'і моцныя” - сцвярджае майстрыха. “Даўней было так, дзяўчына не магла ісці замуж, калі ў яе няма поўнага куфра. Адмысловыя ручнікі павінны быць свату, на ікону і на якім у царкве стаяць будзеш…” Вырабы М.М.Карповіч - гэта сапраўдныя творы мастацтва, выкананыя ў мясцовых традыцыях. У работах уражвае не толькі тэхніка выканання і бездакорны густ, але і шматвобразнасць узораў. Марыя Міхайлаўна з'яўляецца ўдзельніцай народнага фальклорнага гурта “Вяргіня” аддзела культуры і дасуга “Ракавіцкі Дом культуры” дзяржаўнай установы культуры “Шчучынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”. Жанчына з задавальненнем прымае ўдзел у святах, фестывалях, выстаўках народнай творчасці. Яна дапамагае аддзелу рамесніцкай дзейнасці і народнага мастацтва дзяржаўнай установы культуры “Шчучынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці” адраджаць мясцовыя тэхнікі ткацтва, праводзячы майстар-класы для дзяцей і падлеткаў. У лістападзе 2017 года ў выставачнай зале дзяржаўнай установы культуры “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” Марыя Міхайлаўна прыняла ўдзел у абласной выставе народнага мастацтва “З глыбінь народных да нашых дзён”. За шматгадовую працу па захаванні і папулярызацыі традыцыйных рамёстваў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у студзені 2018 года прысвоіла М.М. Карповіч званне “Народны майстар”.







